ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1982

11

ЛІСТАПАДА

ЧАЦВЕР

№ 32 (1370)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

ЗАМЕЖНЫЯ СТУДЭНТЫ

і аспіранты, што навучаюцца ў Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна, прынялі актыўны ўдзел у святкаванні 65-й гадавіны Вялікага Кастрычніка. Вялікая колькасць замежных навучэнцаў горада Мінска прысутнічала ў Палацы культуры тэкстыльшчыкаў на ўрачыстым вечары, арганізаваным Беларускім таварыствам дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі, Мінскім гарадскім саветам па справах замежных навучэнцаў, зямляцтвамі в'етнамскіх, лаоскіх і кампучыйскіх студэнтаў і аспірантаў.

З. АЛЯШКЕВІЧ,
наш кар.

СТАРШЫНІ ПРАФБЮРО

факультэтаў зацверджаны на чарговым пасяджэнні прэзідыума прафкома. Разгледжана таксама пытанне аб актывізацыі культурна-масавай работы ў інтэрнатах.

Н. ТУРОМША,
намеснік старшыні прафкома.

ПЫТАННІ

паспяховасці, удзелу замежных студэнтаў у навуковых даследаваннях, правядзення культурна-масавых мерапрыемстваў былі ў цэнтры ўвагі сустрэчы вядучых выкладчыкаў кафедраў палітэканоміі, марксісцка-ленінскай філасофіі і гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў з прадстаўнікамі зямляцтваў в'етнамскіх, лаоскіх і гвінейскіх студэнтаў.

У. АБРАМОВІЧ,
студэнт журфака.

СУСТРЭЧА

з вядучымі акцёрамі Ленінградскага тэатра імя Ленінскага камсамола адбылася на днях у Палацы мастацтваў Мінска. Актыўнымі яе ўдзельнікамі былі студэнты БДУ імя У. І. Леніна. Яны задалі шмат пытанняў, якія датычаць развіцця сучаснага тэатральнага мастацтва, а таксама выказалі свае думкі на гэту тэму.

І. ВАЛАСЕВІЧ,
супрацоўніца бібліятэкі.

РАЯЦЦА ЖУРНАЛІСТЫ

ПРАБЛЕМЫ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Некалькі дзён назад на факультэце журналістыкі адбылася рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная праблемам далейшага ўдасканалення журналісцкай адукацыі ў БССР.

Пытанні падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў заўсёды былі ў полі зроку партыйных органаў.

І гэта зразумела: журналісты, з'яўляючыся «залатым фондам» партыі, даносяць яе голас да народа, вучаць людзей правільнаму разуменню законаў грамадства і прыроды.

Камуністычны інстытут журналістыкі, адпаведныя кафедры Вышэйшай партыйнай школы, факультэт журналістыкі БДУ заўсёды імкнуліся прывіць будучым журналістам уменне арыентавацца ў палітычных падзеях, веданне існуючых праблем развіцця, нарэшце, жаданне быць сацыяльна-актыўнымі людзьмі.

З пазіцый канкрэтных практычных патрэб разглядзеў праблемы ўдасканалення журналісцкай адукацыі загадчык карпункта газеты «Правда» па Беларусі І. Г. Новікаў.

— Законы развіцця друку,— сказаў І. Г. Новікаў,— дыктуе пераход ад былога паказу адносін паміж рэчамі да паказу адносін паміж людзьмі. Больш цяжкасцей, якія мы перажываем, мае не аб'ектыўны, а суб'ектыўны вытык, гэта значыць залежаць не ад акружаючых абставін, а ад самога чалавека. Іменна адносіны паміж людзьмі ва ўсёй сваёй глыбіні і разнастайнасці павінны быць у цэнтры ўвагі журналістаў.

І. Г. Новікаў выказаў шэраг думак і меркаванняў па пытанню далейшага развіцця адукацыі работнікаў прэсы.

На канферэнцыі выступіў намеснік старшыні камітэта Дзяржтэлерадыё БССР В. Д. Чанін, які спыніўся на недахопах у журналісцкай адукацыі з пункту гледжання радыё- і тэлевізійных праблем. Ім былі выказаны прапановы па ўдасканаленню сувязі вучэбна-метадычных і вытворчых метадаў адукацыі студэнтаў журфака, па павышэнню эфектыўнасці практыкі на радыё- і тэлевяшчанні.

З дакладам на тэму «Выпускнік факультэта: праблемы адукацыі» выступіў рэдактар брэсцкай абласной газеты «Заря» П. П. Суцько.

— Нам патрэбны журналісты,— сказаў П. П. Суцько,— якія могуць пісаць свежа, зацікаўлена, натхнёна. Нам патрэбны людзі, якія па сваіх чалавечых якасцях з'яўляюцца вечнымі шукальнікамі справядлівасці, творча адважнымі асобамі, з унутранай, асабістай патрэбай словам сваім, як справай, умешвацца ў жыццё.

На канферэнцыі выступілі таксама загадчык кафедры ВПШ, дацэнт Г. Л. Напрэеў,

прадстаўнікі мясцовага друку.

У праграму канферэнцыі ўваходзіла работа розных секцый: гісторыі журналістыкі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, міжнароднай журналістыкі і іншых. На іх пасяджэннях было прачытана і заслухана больш 20 дакладаў.

А. МАКСІМАВА,
студэнтка журфака.

Фота **В. Шачака.**

● ВЫКАЖЫ СВАЮ ДУМКУ

Быць на перадавой. Што гэта значыць?

«БЫЦЬ НА ПЕРАДАВОЙ...» Ці заўсёды правільна мы разумеем гэтыя словы? Дзе праходзіць яна, перадавая, для камсамольцаў васьмідзесятых? Напэўна, кожны з нас адкажа на гэта па-рознаму. Рабочы бачыць свой пярэдні край ля гарачай мартэнаўскай печы ці за станком, аграном — на калгасным полі, воін — на дзяржаўнай граніцы ці бязмежных акіянскіх прасторах. Там, дзе складана, дзе неабходны сіла, вынослівасць, уменне.

«Быць на перадавой...» Вымаўляю гэтыя словы і адразу прыпамінаю Ірыну Ляшчонак, студэнтку факультэта журналістыкі, сваю аднакурсніцу. Не першы год ведаю Ірыну. І ўвесь гэты час не перастаю здзіўляцца яе гарэнню, адданасці грамадскай рабоце. Іменна ў ёй бачыць Ірына сваю перадавую. З першага курса яна — член бюро камсамольскай групы, член камітэта камсамола факультэта.

З павагай ставяцца да яе «неспакойных клопатаў» камсамольцы. Але чаго душой крывіць, ёсць і такія, што скептычна ўсміхаюцца: вось калі б мы ўзяліся... Ды толькі далей слоў справы ў гэтых скептыкаў не ідуць.

Згадзіцеся, ці так ужо рэдка чуем мы ад сваіх сяброў, аднакурснікаў, што, маўляў, на ўсё часу не хапае, вопыту, уменя. Але ж ні вопыт, ні ўменне не прыходзяць самі па сабе. Лінія паводзін Ірыны Ляшчонак, яе адносіны да грамадскай работы — лепшае таму пацвярджэнне. Калі ў мінулым годзе камсамольцы факультэта даручылі ёй арганізацыю і правядзенне грамадска-палітычнай практыкі (дарэчы, складаны і адказны ўчастак работы), Ірына справілася з ім выдатна: факультэт заняў вядучае месца ва універсітэце. Усюды паспявала Ірына: і план правядзення атэстацыі скласці, і ў камсамольскіх групах пабываць, і літаратуру ў кабінеце ГПА абнавіць... Тады ж пачула ад яе, што кожны актывіст павінен умець не толькі заклікаць, арганізоўваць, патрабаваць, але і сам, дзе неабходна, сваё ўменне паказаць, быць на строме жыцця.

Можа, гэта толькі словы, толькі дэкларацыя? З поўнай адказнасцю магу сцвярджаць — не! Яна ніколі не імкнулася выдзеліцца сярод аднакурснікаў, не прэтэндавала на ўзнагароды ці нейкія скідкі — яна проста добрасумленна выконвала і выконвае свае абавязкі, не дзелячы справы на грамадскія і асабістыя.

Г. ГРЭЛЬ,
студэнтка журфака.

Трэці працоўны закончыўся,

ПРАЙШОЎ ПЛЕНУМ камітэта камсамола Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, на якім з падвядзеннем вынікаў трэцяга працоўнага семестра выступіў сакратар камітэта камсамола А. Рухля. У сваім дакладзе ён адзначыў, што ў працоўным семестры 1982 года прынялі ўдзел 3128 студэнтаў універсітэта ў саставе 100 лінейных атрадаў. З іх 61 — будаўнічы, 37 — небудаўнічага профілю і 2 абменныя інтэратрады, якія працавалі ў ГДР і НРБ. Геаграфія дыслакацыі была вельмі шырокай: ад Карэліі, Беларусіі і Малдавіі да Башкірыі, Якуціі, Алтайскага і Хабараўскага краёў.

Будаўнічымі атрадамі асвоена звыш 5 мільёнаў рублёў капітальных укладанняў, выпрацоўка на аднаго байца СБА за працоўны семестр склала 3044 рублі.

103 аб'екты былі здадзены ў эксплуатацыю ці пад мантаж абсталявання. Гэтыя паказчыкі значна перавышаюць мінулагоднія. Якасць работ, выкананых СБА, у асноўным выдатная.

Праводзілася вялікая грамадска-палітычная работа. Было прачытана 1694 лекцыі і дадзена 943 канцэрты. Вялікая дапамога была аказана сельскім школам і дзіцячым установам. Усяго атрадамі было адрамантавана 47 школ, арганізавана 79 кансультацыйных пунктаў, перададзена школьным і сельскім бібліятэкам 4819 экземпляраў кніг, падрыхтавана 367 наглядных дапаможнікаў, абсталявана 89 спецкабінетаў і фоталабараторый, арганізавана 35 лагераў «Спадарожнік».

Атрадамі універсітэта была праведзена вялікая работа ў аперацыі «Памяць» — адрамантаваны 93 помнікі воінам, загінуўшым у час Вялікай Айчыннай вайны, аказана дапамога ветэранам вайны і працы, запісана 216 успамінаў удзельнікаў вайны.

Усе студэнцкія атрады залічылі ганаровымі байцамі герояў вайны і працы. За ганаровых байцоў было пералічана ў Фонд міру 35297 рублёў. За дні ўдарнай працы ў фонд брацкіх саюзаў моладзі, фонд горада Гагарына і фонд піянерскай арганізацыі СБА БДУ імя У. І. Леніна пералічана 53022 рублі.

Выконваючы рашэнні майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС, удзельнічаючы ў рэалізацыі Харчовай праграмы, байцы СБА адпрацавалі на суботніках 10992 чалавека-дні. Было нарыхтавана 423 тоны сіласу, 1793 тоны сена і 531 тона сенажу. Небудаўнічымі атрадамі сабрана 8614 тон гародніны, 178 тон садавіны, убрана 210 тон саломы, 2380 тон збожжавых, апрацаваны 791 гектар зямлі.

Акрамя таго, асеннімі сельгасатрадамі ў Магілёўскай вобласці ўбрана 30100 тон бульбы, 8183 тоны караняплодаў, пералапачана 11422 тоны збожжа, нарыхтавана 4599 тон сіласу і сенажу, убрана 1877 тон саломы, паднята 2251 тона льну.

Месцы сярод факультэтаў па выніках агляду-конкурсу зводных студэнцкіх атрадаў размеркаваліся наступным чынам:

1 — юрыдычны
2 — гістарычны
3 — хімічны
4 — фізічны
5 — механіка-матэматычны
6 — радыёфізічны
7 — ФПМ
8 — журналістыкі
9 — філалагічны
10 — біялагічны
11 — геаграфічны.

Разам з гэтым на пленуме былі выказаны крытычныя заўвагі па арганізацыі студэнцкіх атрадаў на філалагічным, біялагічным, геаграфічным факультэтах.

На пленуме быў прыняты Зварот «Харчовай праграме — клопат студэнцкага камсамола».

У СПАБОРНІЦТВЕ СПРАВА СПОРЫЛАСЯ

УЖО ЧАЦВЁРТЫ год запар выязджаюць на палеткі Шклоўшчыны сельгасатрады факультэта прыкладной матэматыкі. Сёлета ў адзінаццаці гаспадарках раёна працавала звыш 600 студэнтаў ФПМ.

Трэба адзначыць высокі ўзровень працоўнага энтузіязму, з якім уключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу 60-годдзя з дня ўтварэння СССР байцы ўсіх ССГА факультэта. Шклоўскі РК ЛКСМБ кожныя 10 дзён падводзіў вынікі спаборніцтва сярод сельгасатрадаў, узнагароджваў атрад-пераможцу пераходным Чырвоным сцягам.

За перыяд з 12 верасня па 14 кастрычніка студэнты ФПМ апрацавалі і здалі дзяржаве 1067 тон ільну, 3353 тоны бульбы, 5143 тоны збожжа, 1425 тон буракоў.

Па-ўдарнаму папрацавалі ў саўгасе «Дняпроўскі» байцы сельгасатрада «Світанак». Гэты атрад быў лепшым у раёне. На працягу трох дзесяцідзённак ён утрымліваў пераходны Чырвоны сцяг РК ЛКСМБ, а па выніках спаборніцтва быў узнагароджаны Ганаровай граматай Шклоўскага РК КПБ.

Света Ковель, студэнтка 1-га курса з атрада «Аўрора», першай у раёне звязала 700 снапоў ільну пры норме 160. Яна выклікала на спаборніцтва ўдарнікаў другіх атрадаў. Па 800—900 снапоў звязвалі рабяты, а ўсё ж апошняе слова засталося за Светай — 1015 снапоў.

«Асенні дзень год корміць» — гэтыя словы добра памяталі байцы сельскагаспадарчых атрадаў ФПМ. Студэнты сваёй ударнай працай дапамаглі ў тэрмін выканаць многія неадкладныя сельскагаспадарчыя работы. Так, байцы ССГА «Паскаль» Д. Бацечка, А. Грыбоўскі, В. Сафронаў, В. Тамашоў забяспечылі своечасовую адгрузку больш 600 тон бульбы ў мяшках. Студэнткі II курса В. Шэвель і І. Мігаль разгрузілі чатырохтонную машыну льну за дзве гадзіны. Студэнты В. Міронаў і К. Шахлевіч з атрада «Світанак» у складаных умовах надвор'я засеялі за дзень 14 гектараў азімых.

Байцы сельгасатрадаў праводзілі вялікую масава-палітычную работу ў вёсках. Выступленні агітбрыгад на палявых станах, лекцыі, вечары паэзіі, дыскатэкі, дапамога ветэранам, рамонт помнікаў — гэта далёка не поўны пералік добрых спраў, што зроблены імі на Шклоўшчыне.

Вынікі асенняга семестра радуюць калектыў факультэта, але трэба прыкласці ўжо сёння шмат намаганняў, каб працоўныя здабыткі ў наступным годзе былі яшчэ больш важкімі.

М. ФЕДЗЯНЯ,
сакратар партбюро ФПМ.

ХАРЧОВАЙ ПРАГРАМЕ — КЛОПАТ СТУДЭНЦКАГА КАМСАМОЛА

ЗВАРОТ
СТУДЭНТАЎ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

Мы, студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, звяртаемся да студэнтаў ВНУ і тэхнікумаў з ініцыятывай — «Харчовай праграме — клопат студэнцкага камсамола». Сёння, калі ўвесь савецкі народ працуе над выкананнем рашэнняў XXVI з'езда КПСС, майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС, шматмільённая армія студэнтаў не можа стаяць у баку ад гэтай важнай справы. Нашы рукі, наш энтузіязм, наша энергія патрэбны Радзіме, патрэбны народнай гаспадарцы, калгаснаму полю, фермам, школам. Ужо сёння студэнцкія будаўнічыя атрады, большасць якіх працуе на сельскагаспадарчых аб'ектах, і сельскагаспадарчыя атрады з'яўляюцца нашым канкрэтным укладам у справу рэалізацыі Харчовай праграмы. Гэты ўклад будзе больш важкім, калі мы не абмяжуемся толькі трэцім працоўным семестрам. Калгасам і саўгасам патрэбна наша пастаянная дапамога! Мы заклікаем да стварэння атрадаў, якія будуць на працягу ўсяго года аказваць дапамогу калгасам і саўгасам. У гэтыя атрады павінны ўвайсці лепшыя, ініцыятыўныя студэнты, якія маюць вопыт работы ў сельскай гаспадарцы і СБА. Мы прапануем замацаваць за вучэбнымі ўстановамі раёны, гаспадаркі, палі, участкі, заключыць доўгатэрміновыя дагаворы, аказваць дапамогу сельскім школам, клубам, бібліятэкам, весці лекцыйна-прапагандысцкую і культурна-масавую работу. Асаблівую ўвагу патрэбна ўдзяляць укараненню вынікаў студэнцкіх навуковых работ у сельскагаспадарчую вытворчасць. Мы можам і павінны аказаць дапамогу ў механізацыі і аўтаматызацыі сельскагаспадарчых вытворчых працэсаў, у праектаванні жылых дамоў, жывёлагадоўчых комплексаў, у распрацоўцы сацыялагічных, эканамічных і іншых рэкамендацый. Поле, ферма павінны стаць лабараторыяй для практычнага прымянення нашых ведаў.

Нас, студэнтаў-камсамольцаў, чакаюць калгасы і саўгасы. Наша дапамога вёсцы неабходна, а галоўнае — гэта нам пад сілу!

Для кожнага з нас праца ў сельскагаспадарчай вытворчасці павінна стаць пачэсным абавязкам, як для нашых папярэднікаў сталі цаліна, БАМ, Атаммаш!

«І нарадзілася дружба...»

МЫ — ПЕРШАКУРСНІКІ. Усё для нас новае і непрывычнае ва універсітэце. Студэнцкае жыццё захапіла кожнага. Што і гаварыць, цяжка часам даводзіцца. І тады кожны ўспамінае працу ў саўгасе «Высакоўскі». Там нарадзілася сапраўдная дружба.

Работы былі самыя розныя: на таку і на бульбе, на льне і ў садзе. Давялося нам працаваць і на ўборцы моркві. І нягледзячы на тое, што работа была цяжкая, мы стараліся з усёй сілы. Гультаёў сярод нас не было.

Першаступеннай задачай лічылі: ураджай бульбы, ільну убраць без страт. Асабліва старанна працавалі 17 верасня. Заробленыя ў гэты дзень грошы мы пералічылі ў Фонд міру. Добра працавалі на ўборцы льну Ірына Лук'яненка, Алена Новік. Яны ўзнагароджаны ганаровымі граматамі гаспадаркі.

Акрамя працы на калгасных палетках, мы дапамаглі мясцовай школе аформіць стэнды, прысвечаныя 60-годдзю ўтварэння СССР. Дапамаглі таксама ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, выступалі з канцэртамі перад мясцовым насельніцтвам.

Але мы не забывалі і пра нашы камсамольскія справы. Рэгулярна праводзілі палітінфармацыі, выпускалі «баявыя лісткі».

Праца ў гаўгасе, без сумнення, з'явілася добрай школай станаўлення калектыву.

І. СІМАНАВА,
студэнтка першага курса хімфака.

ударная праца працягваецца

Выхоўвае «Расінка»

ВОСЕМ ГАДОЎ ЗАПАР, з першых дзён заснавання, месцам дыслакацыі атрада «Расінка» стала малдаўскае сяло Копанка. Той, хто аднойчы становіўся байцом «Расінкі», ехаў у Копанку ў другі, трэці раз, ехаў, як у даўно знаёмае, роднае месца, дзе і людзі ўжо не чужыя, і работа звыклая: акучванне вінаграднай лазы, праполка буракоў, цыбулі, перцу, капусты, збор памідораў. У тыя гады і адбываўся ў атрадзе працэс, які называецца ў сацыяльнай псіхалогіі станаўленнем калектыву.

Прадбачу сумненне, ці варта гаварыць пра станаўленне калектыву прымяняльна да студэнцкага атрада, які дзейнічае ўсяго два месяцы? Калі і калектыў, то часовы, сезонны, які праз месяц-другі непазбежна распадаецца. Са знешняга, фармальнага боку яно так, але калі паглядзець знутры?

У многім, зразумела, заслуга самых першых камандзіраў і камісараў «Расінкі» — гэта яны сваёй воляй і энергіяй скіроўвалі жыццё ў атрадзе ў патрэбнае рэчышча. І стала ўжо традыцыяй: дзяўчаты, што пабывалі ў атрадзе, запісваліся ў «Расінку» з ахвотай і на наступны год.

Ірына Кур'янчык, пяцікурсніца механіка-матэматычнага факультэта, якая кожнае сваё студэнцкае лета прысвячала «Расінцы», расказвае:

— Памятаю тоўстую папку з заявамі. На папцы надпіс — «Расінка». Па прыблізных падліках на адно месца — ледзьве не дзесяць чалавек. Можа, і надзеі няма трапіць у атрад? Паддацца адчаю ці ўсё ж паспрабаваць? Гэткія думкі і пачуцці зведала я ў свой самы першы раз...

Увогуле так і павялося: з году ў год збіралася ў «Расінцы» дваццаць—дваццаць пяць чалавек «ветэранаў», ці «старычкоў», як любоўна называюць іх у атрадзе. Згадзіцеся: сярод людзей, якія жывуць разам, заўсёды фарміруюцца і існуюць пэўныя правілы, устаноўкі, нефармальныя законы. А калі яны працуюць не адно лета запар, сама атмасфера, мікраклімат вызначаюцца лепшымі традыцыямі мінулых год. «Навічок» у атрадзе, акунаючыся ў гэтае нябачнае для пабочнага чалавека жыццё, засвойвае гэтыя правілы, устаноўкі і, пераканаўшыся ў іх справядлівасці, становіцца актыўным членам калектыву.

Першакурсніца, якая запісалася ў гэтым годзе ў «Расінку», між іншым, разважала:

— Мне падабаецца ў атрадзе тое, што тут нікога не трэба «падштурхоўваць». Што я маю на ўвазе? Усё тут робяць самі, без усякага націску збоку. Зразумела, гэтак і павінна быць, але для мяне неяк нязвыкла. Да «Расінкі» трапляла ў калектывы, дзе ўмеюць ныць, абурацца, паказваць сваю незадаволенасць, прапанаваць умовы (што там яшчэ?), самі ж пальцам не варухнуць, каб лепей, цікавей жылося. Быццам хтосьці, а не яны самі, вінаваты ў тым, што знемагаюць ад суму... У «Расінцы» дзейнічае прынцып: задумаць—ажыццявіць. І своеасаблівае пасвячэнне «навічкоў» у байцы атрада правялі, і конкурс на лепшы пакой, арганізавалі паездкі ў Кішынёў, Адэсу, Тыраспаль, і вясёлы карнавал правялі. А кожную суботу — традыцыйны «сямейны агаг»...

І ўспамінаецца чыясьці думка: нельга пакідаць на дарозе ні аднаго свайго юнацкага руху, пакінем — потым не паднімем. І — шырэй: у маладосці, калі ты поўны сіл, важна не супакойвацца, маўляў, жыццё яшчэ ўсё наперадзе, усё паспеецца. Маладосць, можа быць, і дадзена чалавеку дзеля таго, каб дзейнічаць, каб усе свае высакародныя намеры абавязкова рэалізаваць у справы, а інакш — грош цана сілам. Тым, хто разумее гэта, многае ўдаецца ў жыцці.

У мінулым годзе «Расінцы» пашанцавала, як гавораць, пабуйнаму. Атрад быў накіраваны ў Якуцкую АССР на ўдарную камсамольскую будоўлю— Нерунгрынскую ГРЭС.

— Спачатку аб гэтым ніхто не ведаў, — успамінае Ала Вярцейка. — Запісваліся ў атрад, каб праз некалькі месяцаў паехаць, як і штогод, у Малдавію. Навіна літаральна ашаламіла ўсіх: месца дыслакацыі атрада «Расінка-81»—пасёлак Сярэбраны Бор, Якуція. Тут і ўсеагульная збянтэжанасць, і пачуццё разгубленасці...

— А радасць і энтузіязм, — расказвае Ірына Кур'янчык, — немагчыма перадаць словамі. Ведалі Якуцію як край раманцікі, маладосці, працоўных здзяйсненняў. Працавалі сумленна.

У пасёлку Сярэбраны Бор яны рыхтавалі да здачы кватэры: штукатурылі, шпаклявалі, фарбавалі.

Света Касцюк смяецца:

— Ды я вам зараз так кватэру апрацую — залюбуецеся!

Калі гаварыць аб рысах членаў будатрада «Расінка», то галоўнымі з іх я б назвала ініцыятыўнасць і прынцыповасць усіх і кожнага без выключэння. «Вы неяк адрозніваецеся ад усіх атрадаў, — гаварыла мне дзяўчына з політэхнічнага інстытута. — Занадта ж вы актыўныя, ці вам больш за ўсіх трэба?»

У гэтым годзе атрад «Расінка» працаваў зноў у Малдавіі, на кансервавым заводзе «Кастрычнік» у пасёлку Красным Слабадзейскага раёна. У вольны ад работы час дзяўчаты дапамагалі калгаснікам праполваць буракі. Працавалі, як заўсёды, зладжана. Калі вярнуліся аднойчы ў лагер, хтосьці пажартаваў:

— Люда Навумік кожны бурачок, як клумбу, апрацоўвала.

— Клумбу не клумбу, — сур'ёзна адказала Люда, — а па-іншаму працаваць не магу.

Мяркую, што не зусім дакладным з'яўляецца словазлучэнне «дружны калектыў», бо само слова «калектыў» ужо падразумявае і дружбу, і сяброўскую злітнасць. Вымаўляем мы гэта спалучэнне часцей за ўсё механічна, прыняўшы яго за адну з характарыстык пэўнага кантынгенту людзей. Можа таму, расстаўляючы кропкі над «і» ў размове пра калектыў (але ці магчыма гэта?), не хацелася б мне збівацца на штампы.

Так, «Расінка» — калектыў, сам дух калектывізму стаў тут спадчынным, пераходным з пакалення ў пакаленне. Але і такая высокая форма арганізацыі людзей, як калектыў, не можа быць гарантыяй ад канфліктных сітуацый, ад памылак. Як, дапусцім, пік поспеху — гэта не гарантыя ад непрыемных выпадковасцей, неверагодных промахаў. Але ў гэтым і заключаецца высокі, першапачатковы сэнс такіх паняццяў, як «дружба», «злітнасць» і іншых складаемых калектыву, дзе ўсё разам, сумесна: і пераадоленне цяжкасцей, і аналіз памылак, і пошук правільнага шляху...

А. ЛЫСЮК,
баец СБА «Расінка».

ТВАЯ АКТЫЎНАЯ ЖЫЦЦЁВАЯ ПАЗІЦЫЯ

КОЖНЫМ ДНЁМ СВАЙГО ЖЫЦЦЯ сцвярджаць непахісную вернасць ленінскім запаветам, самааддана змагацца за ажыццяўленне рашэнняў партыі — гэта імкненне юнакоў і дзяўчат краіны ярка адлюстроўвае Ленінскі залік. Для мільёнаў яго ўдзельнікаў залік стаў школай камуністычнага выхавання, дапамагае авалодваць рэвалюцыйнай тэорыяй, ператвараць атрыманыя веды ў канкрэтны вынік сваёй работы на карысць сацыялістычнай Айчыны.

Па традыцыі патрабавальная, прынцыповая размова аб тым, як юнакі і дзяўчаты выконваюць свае асабістыя планы,

Наперадзе — грамадска-палітычная атэстацыя

грамадскія даручэнні, пойдзе на штогадовай грамадска-палітычнай атэстацыі. У камсамольскай арганізацыі універсітэта грамадска-палітычная атэстацыя будзе праходзіць у лістападзе — снежні. Прамежкавая атэстацыя ўдзельнікаў Ленінскага заліку па ГПА праводзіцца ў сакавіку кожнага года. Садзейнічаючы павышэнню ўзаемнай адказнасці асобы і калектыву, ажыццяўленню важнейшага прынцыпу камсамольскай работы — «дайсці да кожнага», атэстацыя павінна насіць калектыўны характар, праводзіцца на камсамольскіх сходах у пярвічных арганізацыях і групах. На кожным факультэце ствараюцца атэстацыйныя камісіі, задача якіх заключаецца ў аказанні дапамогі ўдзельнікам заліку ў распрацоўцы і ажыццяўленні асабістых комплексных планаў, падрыхтоўцы да грамадска-палітычнай атэстацыі.

Прыкладны пералік пытанняў у ходзе грамадска-палітычнай атэстацыі ўдзельнікаў ленінскага заліку «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!»

1. Глыбокае і творчае авалоданне ведамі. Навукова-даследчая работа, навукова-тэхнічная творчасць.

а) паляпшэнне паспяховасці, павышэнне якасці ведаў па агульнаадукацыйных і спецыяльных дысцыплінах;

б) паляпшэнне паспяховасці, павышэнне якасці ведаў па грамадска-палітычных дысцыплінах;

в) удзел ва Усесаюзнай алімпіядзе «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс»;

г) удзел у навукова-даследчай рабоце (работа ў прадметных і навуковых гуртках, на кафедрах, у СКБ, у СВЦ, іншыя формы НДРС);

д) удзел у конкурсе студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ, міжнароднаму маладзёжнаму руху (напісаць работу і выступіць у групе, на тэарэтычнай канферэнцыі універсітэта, падрыхтаваць работу на рэспубліканскі, усесаюзны туры конкурсаў);

е) удзел у конкурсе на лепшую студэнцкую работу па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках (напісаць работу і выступіць у групе, на канферэнцыі ва універсітэце, падрыхтаваць работу на рэспубліканскі, усесаюзны туры конкурсу);

ж) іншая работа.

2. Вывучэнне марксісцка-ленінскай тэорыі, дакументаў КПСС, ВЛКСМ.

а) самастойнае вывучэнне ленінскіх работ, дакументаў КПСС, ВЛКСМ (пералік работ, наяўнасць канспекта);

б) удзел у ленінскіх уроках (падрыхтаваць даклад, выступіць).

3. Грамадска карысная праца.

а) удзел у рабоце студэнцкіх будаўнічых атрадаў;

б) работа на ўнутрыуніверсітэцкім будаўніцтве;

в) удзел у суботніках;

г) удзел у сельскагаспадарчых работах.

4. Павышэнне культурнага ўзроўню. Ваенна-тэхнічная і фізічная падрыхтоўка.

а) знаёмства з творчасцю класікаў літаратуры і мастацтва, гістарычнымі і мастацкімі каштоўнасцямі (якія тэатры, выстаўкі, кіналекторыі прапануе наведаць, з творчасцю якога пісьменніка, мастака збіраецца пазнаёміцца);

б) удзел у розных формах мастацкай самадзейнасці;

в) арганізацыя вечароў адпачынку, вусных часопісаў, удзел у рабоце клубаў па інтарэсах, творчых аб'яднанняў і іншых;

г) удзел ва Усесаюзным паходзе па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа (удзел у зорным паходзе, напісанне летапісу камсамольскай арганізацыі і гісторыі універсітэта, работа па напісанню летапісу народнай славы ў саставе пошукавых груп студэнцкіх будаўнічых атрадаў і сельскагаспадарчых атрадаў);

д) удзел у першынстве па мнагабор'ю комплексу ГПА, здача норм ГПА;

е) заняткі фізічнай культурай і спортам (спартыўныя секцыі, від спорту, якім думаеце займацца);

ж) іншая работа.

5. Грамадска - палітычная практыка.

а) работа ў партыйных, савецкіх, прафсаюзных, камсамольскіх і іншых грамадскіх арганізацыях;

б) выкананне грамадскіх даручэнняў, звязаных з масава-палітычнай работай (агітатар, палітінфарматар, член рэдкалегіі, культурна-масавых, інтэрнацыянальных камісій і інш.);

в) выкананне даручэнняў па спартыўнай, абаронна-масавай рабоце і ахове грамадскага парадку (суддзя, кіраўнік секцыі, член ДНД, дружыны па ахове прыроды і інш.);

г) выкананне даручэнняў па рабоце з падлеткамі, па шэфскай рабоце (шэфства над «цяжкімі» падлеткамі, кіраўнік гуртка, секцыі, атрадны важаты, удзельнік будаўніцтва, афармлення школьных памяшканняў у перыяд вучобы, работы ў СБА і сельгасатрадах);

д) выкананне іншых грамадскіх даручэнняў;

е) вучоба ў школе маладога лектара і іншых секцыях і аддзяленнях факультэта грамадскіх прафесій;

ж) удзел у прапагандысцкай і агітацыйнай рабоце (выступленне з палітінфармацыяй, лекцыяй, гутаркай у групе, у вытворчым калектыве ў перыяд вытворчай і вучэбнай практыкі, працоўнага семестра, сельскагаспадарчых работ і канікулаў);

з) работа ў агітбрыгадзе факультэта, курса, удзел у конкурсах агітбрыгад, мастацкай самадзейнасці;

і) аказанне дапамогі таварышам па вучобе, удзел у выхаваўчай рабоце са студэнтамі 1-га курса;

к) удзел у падрыхтоўцы і правядзенні камсамольскіх і прафсаюзных сходаў, выступленні на іх;

л) удзел у падрыхтоўцы і правядзенні масавых мерапрыемстваў у групе, на курсе, на факультэце, ва універсітэце;

м) грамадска-палітычная работа на вытворчай практыцы;

н) работа па спецыяльнасці, набытай на факультэце грамадскіх прафесій.

КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.

ІНТЭРВ'Ю БЯРЭ ЧЫТАЧ

Вырашчанае — захаваць

Асаблівасці кліматычнай зоны нашай рэспублікі заключаюцца ў тым, што вытворчасць асноўных прадуктаў харчавання мае сезонны характар. Гэта патрабуе эфектыўнага захоўвання садова-гароднінай прадукцыі. Харчовая праграма ставіць шэраг задач у даным напрамку і перш за ўсё — зніжэнне страт садова-гароднінай прадукцыі ў працэсе захоўвання. Распрацоўкай праблемы займаюцца сёння вучоныя кафедры біяфізікі фізічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна.

Студэнтка журфака пабывала ў лабараторыі і сустрэлася з яе загадчыкам Барысам Аркадзьевічам Татарынавым.

— Ці даўно вы займаецеся гэтай праблемай і як падыходзіце да яе вырашэння?

— Кафедра біяфізікі пачала работы па пошуку новых спосабаў захоўвання прадукцыі сельскагаспадарчай вытворчасці больш за пяць гадоў назад. Было даказана, што адным з найбольш эфектыўных метадаў скарачэння страт і павелічэння тэрмінаў выкарыстання садавіны і гародніны з'яўляецца прымяненне азону.

Азон валодае бясспрэчнымі перавагамі ў параўнанні з іншымі хімічнымі сродкамі апрацоўкі: ён хутка дэзактывіруецца і не патрабуе спецыяльных мер па вывядзенню яго са сховішча. Сыравінай для яго атрымання з'яўляецца паветра, ён можа быць атрыманы нават у сховішчах.

— Які эфект уздзеяння азону на садова-гароднінную прадукцыю?

— Апрацоўка азонам прадухіляе развіццё працэсаў гніення, затрымлівае праростанне, а таксама ўмацоўвае покрыўныя тканкі, што забяспечвае большую ўстойлівасць пладоў да транспарціроўкі і захавання.

— Якія першыя вынікі вашых вопытаў? Дзе яны ўкаранёны?

— На кафедры біяфізікі распрацаваны тэхналагічныя спосабы выкарыстання азону на розных стадыях падрыхтоўкі і захавання прадукцыі, а таксама вызначаны рэжымы азоннай апрацоўкі бульбы, морквы, яблыкаў. Актыўна праводзяцца работы па ўкараненню азоннай тэхналогіі на садавіна-гароднінных базах і ў гаспадарках рэспублікі.

— На сённяшні дзень у вас ёсць, бадай, дастатковы аб'ём інфармацыі аб уласцівасцях біялагічных сістэм. А гэта, напэўна, дазволіць вырашыць і іншыя праблемы, звязаныя з захаваннем і перапрацоўкай прадукцыі?

— Зразумела. Паралельна мы займаемся стварэннем аўтаматычных метадаў кантролю якасці і лёжказдольнасці прадукцыі, якія забяспечаць аператыўнае кіраванне захаваннем і рэалізацыяй садавіны і гародніны, а таксама знізяць іх страты.

— Ці магчыма вынікі Вашых доследаў выкарыстоўваць і ў іншых галінах аграпрамысловага комплексу?

— Бясспрэчна. Распрацаваны плёначныя пакрыцці, якія прадухіляюць усушку мяса пры яго халадзільнай апрацоўцы. Зараз праходзяць вопытна - прамысловыя выпрабаванні гэтых пакрыццяў.

І. БАРДЗІЯН,
студэнтка факультэта журналістыкі.

ПАЛАЖЭННЕ

АБ ФЕСТЫВАЛІ-АГЛЯДЗЕ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ ФАКУЛЬТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА, ПРЫСВЕЧАНАГА 60-ГОДДЗЮ З ДНЯ ЎТВАРЭННЯ СССР.

Асноўнымі задачамі агляду мастацкай самадзейнасці факультэтаў з'яўляюцца:

— прапаганда сродкамі самадзейнага мастацтва дасягненняў Краіны Саветаў;

— раскрыццё кіруючай ролі КПСС у грамадстве развітога сацыялізму;

— паказ гераічнай гісторыі КПСС, Савецкай дзяржавы;

— расказ аб братняй дружбе народаў нашай шматнацыянальнай Радзімы;

— паказ сучасных працоўных здзяйсненняў савецкага народа, які ажыццяўляе рашэнні гістарычнага XXVI з'езда КПСС. Вобразнае адлюстраванне дасягненняў беларускага народа ў братняй сям'і народаў;

— дэманстрацыя лепшых узораў беларускай нацыянальнай культуры;

— павышэнне ідэйна-мастацкага ўзроўню самадзейнага мастацтва;

— асваенне яго новых відаў і жанраў;

— узбагачэнне рэпертуару лепшымі творамі айчыннай і замежнай класікі;

— далейшае ўдасканаленне самадзейнай мастацкай творчасці на факультэтах;

— развіццё творчых магчымасцей самадзейных выканаўцаў. Узмацненне ролі самадзейных калектываў у камуністычным выхаванні працоўных;

— выяўленне лепшых калектываў мастацкай самадзейнасці і асобных выканаўцаў.

Арганізатарамі фестывалю-агляду з'яўляюцца рэктарат, партком, камітэт камсамола, прафком.

Праводзіцца фестываль-агляд з 6 па 18 снежня. Яго рэзультаты будуць улічвацца пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва паміж падраздзяленнямі. Пераможцы будуць узнагароджаны Ганаровымі граматамі, прэміямі, сувенірамі.

ДЛЯ ВАС, КНІГАЛЮБЫ!

КНІЖНАЕ МОРА рэспублікі папаўняюць сёння 90 выдавецтваў краіны. Штогод беларускаму чытачу прапануюцца тысячы назваў кніг. Аднак попыт сучаснага чытача задавальняецца далёка не поўнасцю.

Важным рэзервам папаўнення кніжнага рынку з'яўляецца далейшае развіццё і ўдасканаленне букіністычнага гандлю. Вялікай папулярнасцю карыстаецца ў мінчан адна з прагрэсіўных яе форм — кнігаабмен. Ажыццяўляецца кнігаабмен у сталіцы спецыялізаванымі магазінамі: № 40 «Букініст» (пр. Партызанскі, 147), № 47 «Знаходка» (вул. Валгаградская, 23), аддзеламі кнігаабмену ў магазінах № 19 «Метадычная кніга» (вул. Харкаўская, 70, корпус 2), № 43 (вул. Кабушкіна, 63), № 49 (вул. Авангардная, 61, корпус 3).

Абменны фонд магазіна «Знаходка» — гэта больш за 3 тысячы экземпляраў кніг, каля 2 тысяч назваў. У магазіне шырока прадстаўлены асобныя выданні мастацкай літаратуры і зборы твораў рускіх, савецкіх і замежных аўтараў: Ф. Дастаеўскага, І. Тургенева, А. Купрына, К. Паустоўскага, М. Шолахава, Д. Голсуорсі, Г. Уэлса, Э. Хэмінгуэя і іншых. Вялікі асартымент выданняў такіх папулярных серый, як «Жыццё ў мастацтве», «Жыццё вядомых людзей», «Майстры сучаснай прозы», «Замежны раман XX стагоддзя». У абменным фондзе прадстаўлены таксама выданні па мастацтву, альбомы.

Калі вы пажадаеце набыць кнігу з гэтага фонду, працаўнікі магазіна раскажуць, якое выданне трэба прапанаваць узамен. Абмен адбудзецца толькі ў выпадку аднолькавай каштоўнасці кніг. Вызначаючы ступень «аднолькавасці» ў каштоўнасці кніг, прадавец-кансультант улічвае шматлікія фактары: попыт на прапанаваныя кнігі, колькасць і частата выданняў, серыйнасць, мастацкае афармленне, паліграфічнае выкананне і інш.

Не заўсёды неабходная пакупніку кніга бывае ў абменным фондзе. У гэтым выпадку можна выкарыстаць так званы мэтавы кнігаабмен. Кніга, якая належыць абмену, купляецца, магазінам і выстаўляецца ў гандлёвай зале. На яе запаўняецца картка, у якой указваецца неабходнае выданне. На працягу двух месяцаў супрацоўнікі магазіна будуць займацца яго пошукамі. Калі ж за гэты тэрмін варыянт абмену не будзе знойдзены, былому гаспадару прадастаўляецца магчымасць выкупіць сваю кнігу.

Здараецца, што ў магазіне вы ўбачылі выданне, якое вас зацікавіла, а кнігі для абмену з сабой няма. Абмен па вашай просьбе можа быць адкладзены на заўтра. На працягу 24 гадзін магазін гарантуе захаванасць выбранай вамі кнігі.

Толькі за 9 месяцаў гэтага года супрацоўнікі магазіна «Знаходка» наблізілі радасць сустрэчы з цікавай кнігай для 18 тысяч кнігалюбаў, а сума кнігаабмену за гэты час дасягнула 102,4 тысячы рублёў.

Тым, хто жадае выкарыстаць паслугі магазінаў і аддзелаў кнігаабмену, хочацца напомніць аб неабходнасці мець пры сабе пашпарт.

Л. ГРЫГОР'ЕВА,
старшы рэдактар аддзела прапаганды кнігі Мінаблкнігагандлю.

КІШЫНЁЎСКІ ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна свой адлік гадоў вядзе з 12 кастрычніка 1945 года, калі савецкі ўрад, нягледзячы на пасляваенныя цяжкасці, прыняў рашэнне аб адкрыцці ў Кішынёве дзяржаўнага універсітэта.

Стварэнне і развіццё універсітэта на малдаўскай зямлі з'яўляецца яркім праяўленнем перамогі ленінскай нацыянальнай палітыкі, якую няўхільна і паслядоўна ажыццяўляюць Камуністычная партыя і савецкі ўрад.

10 ЛІСТАПАДА — ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ МІЛІЦЫІ

На варце правапарадку

З ВЯЛІКІМ ідэйна-палітычным і працоўным уздымам сустрэлі савецкія людзі 65-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Кожны пражыты дзень — барацьба за выкананне рашэнняў XXVI з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, пленумаў (1982 г.) Пленума ЦК КПСС. Сёлетні год — год шасцідзесяцігоддзя ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Словы «Табе, Радзіма,— наша ўдарная праца!» сталі асабістым лозунгам кожнага савецкага чалавека.

Добрых вынікаў у юбілейным годзе дасягнулі работнікі міліцыі Маскоўскага аддзела ўнутраных спраў горада Мінска.

Добрасумленна выконваюць свой службовы абавязак ветэраны міліцыі Т. Р. Пальгунова, І. П. Гайдук, С. А. Кручонак, а таксама маладыя супрацоўнікі міліцыі С. М. Гірэль, С. В. Гулякевіч, В. К. Каламнец, М. І. Ігнатовіч, М. В. Сінкевіч і многія іншыя.

Актыўнымі памочнікамі міліцыі з'яўляюцца дружыннікі. Хацелася б падзякаваць за актыўны ўдзел у ахове правапарадку дружыннікам медінстытута, Белдзяржуніверсітэта і абутковага вытворчага аб'яднання «Прамень».

Віншуем усіх работнікаў органаў унутраных спраў з Днём савецкай міліцыі і жадаем ім поспехаў у службовай дзейнасці па ўмацаванню правапарадку ў горадзе.

Л. ЦІМАХАВЕЦ,
начальнік аддзела Маскоўскага РАУС г. Мінска.

ДА 60-ГОДДЗЯ ЎТВАРЭННЯ СССР

Флагман вышэйшай школы Малдавіі

Зараз Кішынёўскі універсітэт з'яўляецца буйнейшай ВНУ Малдавіі, адным з асноўных цэнтраў навукі, культуры і асветы рэспублікі. Яго па праву называюць флагманам вышэйшай адукацыі савецкай Малдавіі.

За гады свайго існавання Кішынёўскі універсітэт падрыхтаваў больш 30 тысяч высококваліфікаваных спецыялістаў па 27 спецыяльнасцях, якія працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі.

За вялікія заслугі ў развіцці навукі і падрыхтоўцы высококваліфікаваных спецыялістаў у 1971 годзе да сцяга універсітэта быў прымацаваны ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Кішынёўскі універсітэт — адзін з нямногіх універсітэтаў краіны, якія з'яўляюцца членамі Міжнароднай асацыяцыі універсітэтаў. Ён мае шырокія сувязі з многімі універсітэтамі замежных краін. Больш 600 юнакоў і дзяўчат з 54 краін Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі з'яўляюцца студэнтамі і аспірантамі Кішынёўскага універсітэта. За заслугі ў падрыхтоўцы спецыялістаў для СРВ у 1978 годзе універсітэт быў узнагароджаны ордэнам «Дружбы» Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам. У 1979 годзе за поспехі ў падрыхтоўцы спецыялістаў для ГДР універсітэт узнагароджаны залатым знакам.

Сёння універсітэт размешчаны ў васьмі карпусах, у якіх 4 праблемныя навукова-даследчыя лабараторыі, больш 40 кабінетаў, аснашчаных сучасным абсталяваннем, 120 навуковых лабараторый.

Ва універсітэце ў цяперашні час на 16 факультэтах, уключаючы 3 завочныя, займаецца больш 13 тысяч студэнтаў, прадстаўнікоў 78 нацыянальнасцей.

Калектыўны карэспандэнт — рэдакцыя газеты «Кишиневский университет».

БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

11 лістапада 1982 г.
Зак. 1972 АТ 21570

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ